## Для нататкаў





222228 Мінская вобласць,
Смалявіцкі раён,
вул. Школьная, д. 14А

Тэл.: (01776) 41 3 48, 41 3 20
E-mail: verchmn-school@tut.by
www.verchmen.schools.by

Дзяржаўная ўстанова адукацыі
“Верхменская сярэдняя школа
імя В.А.Тумара»

**ПАРАДЫ НАВУЧЭНЦАМ**

# ПА ПАДРЫХТОЎЦЫ І ЗДАЧЫ ЭКЗАМЕНА ЗА ПЕРЫЯД НАВУЧАННЯ І ВЫХАВАННЯ НА II СТУПЕНІ АГУЛЬНАЙ СЯРЭДНЯЙ АДУКАЦЫІ

# ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ



**Аграгарадок Алесіна**

## Як пісаць дыктант

1.Настаўнік чытае ўголас увесь тэкст дыктанта. Уважліва паслухайце яго.
2.Настаўнік тлумачыць незразумелыя словы, запісвае іх на дошцы, таксама запісвае ўласныя назвы. Звярніце на іх увагу.
3.Пасля тэкст чытаецца па асобных сказах: сказ чытаецца цалкам, затым дыктуецца па частках, потым яшчэ раз чытаецца поўнасцю. Пісаць сказ трэба пачынаць тады, калі настаўнік чытае яго па частках другі раз. Калі настаўнік будзе чытаць сказ трэці раз, уважліва праверце напісанае.
Пастарайцеся пры першым чытанні асэнсаваць структуру сказа (просты ці складаны), звярніце ўвагу на наяўнасць устаўных канструкцый, якія чуюцца выразна. У час запісу сказа па частках рэкамедуецца не ставіць знакаў прыпынку (выключэннем можа быць толькі выдзяленне ўстаўных каструкцый, пастаноўка косак перад супраціўнымі злучнікамі), а цалкам засяродзіць увагу на напісанні слоў. Знакі прыпынку варта расстаўляць, калі сказ яшчэ раз чытаецца поўнасцю.
4.Калі будзе напісаны ўвесь тэкст, настаўнік яшчэ раз выразна прачытае яго. Менавіта цяпер можна праверыць напісанае, асэнсаваць знакі прыпынку.
5.Час на самаправерку (5 хвілін).

## Як правяраць напісанае

Па сутнасці, тэкст ужо правяраўся пры апошнім чытанні. Аднак варта звярнуць увагу на:

**-правапіс** о, э, а (ы), **а таксама** е, ё, я (удалечыні, далячынь; шэры, шарэў);
-напісанне прыслоўяў і спалучэнняў, блізкіх да прыслоўяў;
-ужыванне часціц **не, ні;**
-напісанне часціцы **не** з рознымі часцінамі мовы;
-напісанне прыназоўнікаў (прыназоўніка **с** не бывае).

Для таго, каб правільна паставіць знак прыпынку, трэба высветліць яго ролю ў сказе (раздзяляе аднародныыя члены, часткі простага сказа, ставіцца на месцы пропуску выказніка і г.д.).

Злучнікі, якія сустракаюцца ў тэксце, - гэта своеасаблівыя "падказчыкі", якія дапамогуць у прыняцці правільнага рашэння.

*Але саўладаць з цяплом ужо не магла старая /зіма / і, ледзь паказвалася сонца, ад злосці і бяссілля плакала шчодрымі капяжамі.*

<u>Разважаем:</u> злучнік **і** звязвае аднародныя выказнікі *{не магла саўладаць і плакала),* пасля злучніка дадаены сказ *(плакала / калі / ледзь паказвалася сонца).* Коскі ст аўлю для выдзялення дадаенай часткі складаназалежнага сказа.

Яшчэ адзін прыклад.

*Неба было ўжо не лагоднае, не асмужана-гарачае, а халаднаватае і нядобрае, і, гледзячы на яго, хацелася зашпіліцца ці надзецъ паліто.*

<u>Разважаем:</u> гэта складаны сказ, часткі якога звязаны злучнікам і. Перад гэтым злучнікам ставім коску.

У першым простым сказе ёсць аднародныя члены: *не лагоднае, не асмужана-гарачае* (няма злучніка - ставім коску), **а** (перад супраціўным злучнікам заўсёды ставім коску) *халаднаватае* і (уж ываецца адзін раз коска не патрэбна) *нядобрае. Гледзячы на яго* - адасобленая акалічнасць (дзеепрыслоўны зварот, адасабляецца заўсёды), адасабляем яго коскамі з двух бакоў.